ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.
ЧАЦВЕР
9
ЧЭРВЕНЯ
№ 20 (1578)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

**У наступным нумары чытайце**

З ёй звязваем мы вялікія надзеі, як з рубежнай падзеяй, разлічваючы, што зможа яна знайсці адказы на цяжкія пытанні, якія паўсталі перад намі за тры гады перабудовы.

Учытваемся ў радкі Тэзісаў Цэнтральнага Камітэта КПСС да XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі. Абнародаваўшы гэты дакумент, ЦК КПСС запрасіў кожнага з вас да шырокага абмеркавання ўсіх праблем. Вашай трыбунай павінен стаць увесь друк: ад насеннага да цэнтральнага. З чым згаджаецеся вы, прачытаўшы Тэзісы, што, на ваша меркаванне, патрабуе ўдасканалення? Што жадаеце прапанаваць? Як сфармулюеце сваю пазіцыю?

СТАРОНКІ НАСТУПНАГА НУМАРА ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» — У ВАШЫМ РАСПАРАДЖЭННІ. ДЛЯ ТЫХ, ХТО ПРЫВЫК АПЕРАТЫЎНА ВЫКАЗВАЦЬ СВАЕ ДУМКІ, ПРАПАНУЕМ КАРЫСТАЦЦА ТЭЛЕФОНАМ РЭДАКЦЫІ: — 20-68-27 10 ЧЭРВЕНЯ З 14 ДА 18 ГАДЗІН.

## БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ — ТЭЛЕТАЙП

*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

Каб летам дапамагчы ў выбары месца адпачынку, прафсаюзны камітэт студэнтаў прапануе вам пуцёўкі

**На турыстычныя базы:**

«Дзюны» — Калінінградская вобласць,
«Феадосія».

**У пансіянаты:**

«Асары» — Юрмала,
Дом творчасці ў Рузе — Масква.

**На турыстычныя паязды:**

Масква — Арол — Курск — Белград;
Варашылаўград — Краснадон — Бокава — Платава — Жданаў — Данец.

ВНУ: КРОК ДА ВЫТВОРЧАСЦІ

# ЛЕТАПІС ПАДШЫПНІКАВАГА

А РАНІЦАЙ 29 мая ў дэканаце гістарычнага факультэта патрабавальна гучаў тэлефонны званок:

— Паведаміце, калі ласка, таварышам Сідарцову, Таляронку, Нікіціну і Мазецу — чакаем іх у партыйным камітэце шарыкападшыпнікавага завода. Жадаем выказаць падзяку.

І вось нас, дацэнта кафедры гісторыі СССР эпохі сацыялізму Уладзіміра Нікіфаравіча Сідарцова і трох студэнтаў чацвёртага курса аддзялення агульнай гісторыі ў прахадной сустракаюць дырэктар заводскага музея Пётр Пракопавіч Марчанка і інжынер Леанід Афанасьевіч Жалуна.

Запытаецеся, якая тут сувязь: гістфак і падшыпнікавы завод? Іншая справа, калі б фізікі і «Інтэграл». Аднак сувязь самая што ні на ёсць непасрэдная.

20 мая калектыў МДПЗ-11 адзначыў сваё саракагоддзе. Пасля вайны краіна мела вялікую патрэбу ў падшыпніках, вытворчасць якіх была неабходна для росту і прагрэсу ўсяго машынабудаўніцтва. Адзінаццаты па ліку завод вырашана было будаваць у Мінску.

1948 ГОД. 17 МАЯ. Па распараджэнню Савета Міністраў БССР пачалося будаўніцтва завода на былой ускраіне горада ў раёне Чырвонага ўрочышча». Гэта радкі з «Летапісу МДПЗ-11», які захоўваецца зараз у музеі.

Радасным і ўрачыстым быў дзень 13 жніўня 1951 года, калі выйшаў першы беларускі падшыпнік маркі ДПЗ-11. А сабрала яго Людміла Фёдараўна Арлова, якая і зараз жыве ў Мінску. Завод рос, расшыраў свае плошчы, і вось ужо нашы беларускія падшыпнікі экспартуюцца ў 37 краін, у тым ліку ва ўсе сацыялістычныя.

Аднак да нядаўняга часу гісторыя завода існавала толькі ў свядомасці «старажылаў». Некалькі брашур тэхнічнага профілю ды матэрыялы шматтыражкі «За тэхнічны прагрэс». Вось і ўсе старонкі. Хіба дастаткова, каб, прачытаўшы, кожны навічок адчуў завод родным?

— Тады і звярнуліся да вас,— Пётр Пракопавіч усміхаецца,— як да гісторыкаў-спецыялістаў.

Сапраўды, справа, якой пад кіраўніцтвам У. Н. Сідарцова пачалі займацца студэнты, патрабавала прафесіяналізму. Новае і незнаёмае заўсёды прываблівае. За працу ўзяліся з энтузіязмам. Рэкамендацыі кіраўніка былі компасам у моры папер: інструкцый, загадаў, дырэктыў. Амаль увесь год працавалі хлопцы ў Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці, нямала часу правялі і ў заводскім архіве. У выніку з'явілася кніга «ДПЗ-11. Кароткі гістарычны нарыс», якая ўбачыць свет у канцы гэтага года. Яна будзе садзейнічаць паглыбленню ідэйна-выхаваўчай работы на заводзе, знаёмству маладога пакалення з працоўнымі традыцыямі.

Завод атрымаў, нарэшце, не славесную, а занесеную на паперу (што дазволіць захаваць яе на доўгі час) уласную гісторыю.

Студэнтам праца над кнігай дазволілаператварыць звычайную курсавую работу (часцей за ўсё на гуманітарных факультэтах не маюць яны яшчэ практычнага значэння) у справу, неабходную людзям.

Нямала гучала цёплых слоў, а ў канцы сустрэчы ўдзельнікам падрыхтоўкі рукапісу былі ўручаны Ганаровыя граматы парткома завода, каштоўныя падарункі і, вядома, фотаздымак на памяць.

С. ТАЛЯРОНАК,
студэнт IV курса гістарычнага факультэта.

КАМПЕТЭНТНЫ СУБЯСЕДНІК

# «НЕ МАГУ ГАВАРЫЦЬ ПРА ЖЫЦЦЁ, ЯК ПРА СВЯТА...»

ЁСЦЬ людзі, якія не скардзяцца на лёс, а прымаюць яго такім, які ён ёсць. Не, не таму, што яны, як кажуць, не могуць стукнуць кулаком па стале. Не таму, што маюць мяккі характар. Я б сказала, наадварот: яны ў поўнай меры валодаюць моцнай сілай волі, вялікай вытрымкай, мэтанакіраванасцю, рашучасцю. Проста ў жыцці ім давялося ўсяго дабівацца самім, і яны перакананы, што так і павінна быць.

...Яму часта хацелася ўсё кінуць, забыць, на ўсё махнуць рукой і застацца адзін на адзін з сабой, са сваімі думкамі, з цішынёй нарэшце. Але хутка мінорны настрой праходзіў — і зноў за работу, у кругаварот будняў і спраў, з-за якіх, бывае, не заўважаеш ні выхадных, ні свят. І ўсё ж якая гэта асалода — пастаянна адчуваць напружанне думак, пачуццяў. А калі раптам яно спадае, на душы становіцца пуста.

Аляксандр Сяргеевіч Міхалёў — доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры кібернетыкі факультэта радыёфізікі і электронікі, аўтар амаль ста навуковых распрацовак. Не, гучыць надта афіцыйна і суха. А мне хацелася б сказаць пра гэтага чалавека нешта шчырае і добрае, бо такім жа — шчырым, уважлівым, абаяльным — быў ён у час нашай размовы. Размовы-успаміну, размовы-споведзі. Аляксандр Сяргеевіч разважаў, часам нібы спрачаўся сам з сабой ці з нейкім нябачным субяседнікам. Здаралася, ён апярэджваў мае пытанні, быццам валодаў здольнасцю чытаць чужыя думкі.

— Не магу гаварыць пра жыццё, як пра свята. Пачынаў я ва Уладзівастоку,— успамінае Аляксандр Сяргеевіч.— Работа падабалася, шмат займаўся навукай. Маю кандыдатуру вылучылі на пасаду рэктара інстытута. Але часам абставіны бываюць мацней за нас. І мне таксама давялося стаць перад выбарам: куды пераехаць (жонка і сын дрэнна пераносілі мясцовы клімат). Так я аказаўся ў Мінску. І сёння хочацца выказаць самае шчырае прызнанне ўсім тым, хто сустрэўся ў той час у маім жыцці.

— Аляксандр Сяргеевіч, тут, на кафедры, Вам давялося пачынаць з нуля, бо кафедры не было, існаваў толькі загад аб яе стварэнні. Вы дабіліся таго, што сёння кафедра — адна з самых маладых як па гадах, так і па ўзросту саміх супрацоўнікаў, — займае вядучыя пазіцыі на факультэце.

— Кафедры сапраўды не існавала. Затое ў мяне быў вопыт работы ва Уладзівастоку. Там я ўзначаліў кафедру, якая па лічбавых паказчыках адставала ад астатніх у пяць разоў. Праз год мы выйшлі на першае месца, абагнаўшы другую ў два разы.

Мы вырашылі заявіць аб кафедры кібернетыкі мовай нагляднай агітацыі. Яна, дарэчы, ёсць і сёння. Гэта спадабалася супрацоўнікам. У іх таксама паявілася жаданне працаваць. Паступова складваўся псіхалагічны клімат у калектыве. Да нас прыйшлі першыя студэнты. Яны шмат займаліся ў лабараторыях, прычым не толькі ў час заняткаў. Многія і зараз успамінаюць наш куратарскі «чай». Такія гутаркі за чашкай чаю збліжаюць, ствараюць атмасферу ўзаемаразумення, шчырасці. Студэнты выказвалі набалелае, дзяліліся сваімі думкамі. Мы, выкладчыкі, заўсёды стараліся ўважліва выслухаць іх, дапамагчы, параіць. Бо былі ўпэўнены: наша праца акупіцца ўдвайне. І сапраўды, многія выпускнікі лічылі за шчасце застацца працаваць на кафедры.

— Вы хочаце сказаць, што поспехі кафедры залежаць ад яе маладога папаўнення.

— Безумоўна. У свой час мы пільна прыглядаліся да трэцякурснікаў Ігара Чушанкова і Сяргея Сідарука. Іх вызначалі аналітычны розум, уменне абагульняць і рабіць правільныя вывады, працавітасць, крытычны склад мыслення. Пасля заканчэння факультэта іх накіравалі ў аспірантуру. І Ігар і Сяргей працягвалі працаваць на кафедры. Зараз у кожнага каля 40 навуковых работ, прычым амаль дваццаць з іх — вынаходніцтвы.

Сярод сённяшніх студэнтаў таксама ёсць таленавітыя і здольныя. Пад кіраўніцтвам дацэнта Л. І. Мацюхінай заняты распрацоўкай арыгінальных канцэпцый мікрапра-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

У 1920 годзе чэшскі пісьменнік Карэл Чапек напісаў п'есу «Расумскія універсальныя робаты». Дзеючымі асобамі яе былі звычайныя людзі і створаныя, або штучныя людзі-рабы для выканання цяжкіх фізічных работ. Назва для гэтых штучных людзей — «робаты» — была ўзята ад сугучнага ў чэшскай мове слова, якое абазначала цяжкую фізічную працу (баршчына). Робаты сёння — гэта тэхнічныя сродкі, прызначаныя перш за ўсё для расшырэння фізічных магчымасцей чалавека.

«Кібернетыка. Сістэма кіравання і «ажыўлення» робатаў» — спецыялізацыя кафедры кібернетыкі, якая створана на факультэце радыёфізікі і электронікі ў 1981 годзе. Зараз гэта пяць вучэбных лабараторый: сістэм кіравання і «ажыўлення» робатаў, маторыкі робатаў, радыёэлектронных сродкаў робатаў, сістэм уводу і вываду інфармацыі, функцыянальных падсістэм робатаў, а таксама навукова-даследчая лабараторыя і майстэрня.

За гады свайго існавання кафедра дасягнула пэўных поспехаў у вучэбнай, навуковай і выхаваўчай рабоце, актыўны ўдзел у якой прымаюць студэнты. Адно са значных дасягненняў кафедры — робат-маніпулятар РМ-01, які пабываў на ВДНГ СССР.

Аб сённяшнім і заўтрашнім дні кафедры, яе людзях раскажуць матэрыялы, змешчаныя на першай і другой старонках газеты.



НА ЗДЫМКУ: кіраўнік творчага маладзёжнага калектыву кафедры, малодшы навуковы супрацоўнік С. М. Сідарук.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.).

цэсарных сістэм робатаў Д. Бендэрскі і Д. Калеснік. Фактычна над кандыдацкай дысертацыяй працуе і пяцікурснік А. Аполька, які шукае новыя мікрапрацэсарныя рэгулятары для выканаўчых падсістэм робатаў. Не менш важная тэма — сістэма кіравання біятэхнічных робатаў — і ў А. Белаглазава.

Стаўку на моладзь мы робім невыпадкова. Усё жыццё, пачынаючы з дзіцячага сада, чалавека выхоўвалі, вучылі. У яго ўжо склаліся пэўныя

# «Не магу гаварыць пра жыццё, як пра свята...»

ўяўленні, погляды, перакананні. І калі мы ўпусцім час, то перавучваць будзе вельмі цяжка, бо чалавек псіхалагічна не гатовы да гэтага.

**— Над якімі галоўнымі напрамкамі працуеце Вы і Вашы калегі зараз?**

— Вядзём распрацоўку надзейнай сістэмы кіравання робатаў на аснове бескантактных рухавікоў. Тут ужо дасягнуты станоўчыя вынікі.

Вельмі актуальнай з'яўляецца сёння і праблема «ажыўлення» робатаў. Атрымліваецца парадокс. Мы выпускаем робаты, транспарціруем іх у Фінляндыю, а там на дыскі запісваецца мова праграміравання. Мы, на жаль, не ведалі яе. Праўда, на НВА «Гранат» групе матэматыкаў-праграмістаў удалося расшыфраваць яе, але падзяліцца з намі яны не захацелі. І мы вырашылі даказаць, што таксама не лыкам шытыя. За работу ўзяўся Г. Ф. Астапенка. Чалавек вельмі таленавіты, ён справіўся з пастаўленай задачай за паўтара года (на «Гранаце» працавалі над гэтым пяць гадоў). Так што сёння мы цалкам самастойныя.

**— Аляксандр Сяргеевіч, якімі, на Ваш погляд, якасцямі павінен валодаць вынаходнік?**

— Я б паставіў на першае месца ўменне бясконца фантазіраваць. Пры гэтым нічога не павінна ўспрымацца як канчатковая ісціна. Сапраўды, вынаходнік павінен у кожнай рэчы бачыць недахопы і магчымасць іх ліквідаваць.

І яшчэ адна не менш важная ўмова — быць гатовым да мукаў творчасці.

**— Сёння мы гаворым пра перабудову ва ўсіх сферах жыцця. А ці змяніліся ўзаемаадносіны паміж вучонымі і прадстаўнікамі вытворчасці?**

— Можа гэта будзе вельмі катэгарычна, але я ўпэўнены: усё лепшае на зямлі ствараецца вынаходнікамі. Толькі часта да іх чамусьці адносяцца з іроніяй: усім, маўляў, добра, а ім дрэнна. Пакуль што існуе зусім няправільны пункт гледжання на ўкараненне распрацовак вучоных. Вынаходнік, лічыцца, абавязаны сам шукаць, дзе «прапісаць» сваю ідэю. І каб пераадолець бюракратычныя перашкоды, ён губляе неверагодна многа сіл і часу. Мне ўяўляецца ўсё гэта інакш. Пакуль вынаходнік думае, прадстаўнікі прадпрыемстваў ужо чакаюць моманту, каб атрымаць патрэбную ім распрацоўку. Ідэальная мадэль? Фантастыка? Так. Але да гэтага ідэалу патрэбна імкнуцца.

Гутарку вяла
З. АЛЯКСАНДРАВА.

## У НАВУКОВАЙ ЛАБАРАТОРЫІ



# І аксіёму можна абвергнуць

### ТАК ЛІЧАЦЬ МАЛАДЫЯ ВУЧОНЫЯ КАФЕДРЫ КІБЕРНЕТЫКІ, РАБОТА ЯКІХ ПРАДСТАЎЛЕНА НА АТРЫМАННЕ ПРЭМІІ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ



ЗАРАЗ ужо цяжка сказаць, каму першаму прыйшла гэта ідэя. Праўда, тады ніхто не думаў, што яна будзе ўнікальнай. Ігар Міхайлавіч Чушанкоў, асістэнт кафедры кібернетыкі факультэта радыёфізікі і электронікі, і сёння схільны думаць, што калі б само жыццё не паставіла перад вытворчасцю праблему нізкай надзейнасці робататэхнікі, то магчыма ніякіх вынаходніцтваў не было б.

— Нехта аднойчы параўнаў матэматыку з краўцом-дзіваком, які шые і хавае сваю прадукцыю на склад — глядзіш, некалі каму-небудзь спатрэбіцца,— гаворыць Ігар Міхайлавіч.— І гэта выказванне не пазбаўлена сэнсу. Справа ў тым, што ў матэматыкаў часта навуковыя распрацоўкі слаба падштурхоўваюцца жыццём. У нас жа зусім іншая сітуацыя. Мы, па сутнасці, выконваем заказы вытворчасці. Хоць бывае і наадварот: навука прапануе нешта новае, а заказчыка знайсці цяжка. Тут, думаецца, вінавата ў нейкай ступені дрэнная рэклама, якая амаль адсутнічае. Здараецца, аб распрацоўках вучоных кіраўнікі вытворчасці даведваюцца па чутках. А часта перашкаджае ўкараненню новага няўменне бачыць перспектыву.

На НВА «Гранат» ідэю кафедры спачатку таксама лічылі нечым накшталт вынаходніцтва веласіпеда. І пакуль унікалі ў сутнасць, вырашалі арганізацыйныя і неарганізацыйныя пытанні, робаты з рухавікамі такога тыпу з'явіліся ўжо ў Японіі. Кіраўніцтва «Граната» аказалася няздольным аператыўна вырашаць важныя, надзённыя пытанні па ўкараненню навуковых распрацовак у практыку. А супрацоўнікам кафедры давялося літаральна прабіваць сцяну бюракратыі і валакіты. Карацей, вытворчы прыярытэт застаўся за Японіяй.

Зараз, безумоўна, крыўдна. Але каго вінаваціць? Магчыма ёсць і іх віна ў тым, што не змаглі адразу даказаць: створанае імі — унікальнае, і нічога падобнага ў сусветнай практыцы не было.

Што гэта так, можна пераканацца, чытаючы сёння шматлікія водгукі савецкіх і замежных фірм, якія мелі магчымасць пазнаёміцца з вынаходніцтвам. Вось, напрыклад, якую думку выказалі прадстаўнікі фінскай фірмы «NOKIA»: «Навукова-тэхнічны ўзровень прадстаўленай работы адпавядае і пераўзыходзіць сусветны ўзровень робатабудаўніцтва, што пацвярджаецца вялікай колькасцю вынаходніцтваў кафедры кібернетыкі. Распрацоўка сервадзінаў (бескантактных рухавікоў пастаяннага току.— Заўвага аўт.) кафедры вельмі актуальная для патрэб нашай фірмы».

У апошнім — увесь сэнс вынаходніцтва. І. М. Чушанкоў і С. М. Сідарук ледзь не на пальцах спрабуюць растлумачыць мне, чалавеку далёкаму ад робататэхнікі, у чым жа навізна іх распрацоўкі. Я імкнуся зразумець і, прызнацца, пачынаю ўнікаць у сутнасць. Да размовы падключаецца асістэнт кафедры В. М. Малафееў.

— Што такое робаты сёння, усе, безумоўна, ведаюць. І тое, што выкарыстанне робататэхнікі дазволіць павысіць прадукцыйнасць працы, якасць прадукцыі, знізіць яе сабекошт,— гэта таксама ніхто аспрэчваць не будзе. Вельмі важна і іншае: мы вызвалім чалавека ад манатонных і шкодных аперацый.

Разам з тым шырокае выкарыстанне робатаў стрымліваецца іх нізкай надзейнасцю і недаўгавечнасцю. «У чым жа справа?» — задумаліся супрацоўнікі кафедры. І самі адказалі на сваё пытанне: «Разгадку патрэбна шукаць ва ўдасканаленні рухавіка».

Ідэю «падкінуў» загадчык кафедры, прафесар Аляксандр Сяргеевіч Міхалёў. Ён прыйшоў на факультэт ужо вучоным са стажам, з імем. У яго быў вопыт стварэння бескантактных рухавікоў у іншых галінах тэхнікі. Правялі аналогію, паспрабавалі, прыкінулі. І пачалася работа: напружаная, карпатлівая. Не ўсё атрымлівалася адразу. Бывала, пасля чарговага доследу пачыналі сумнявацца:

— Няўжо дзе-небудзь памыліліся, чагосьці не ўлічылі?

Спрабавалі зноў і зноў. Працавалі (асабліва калі нешта не ўдавалася) амаль круглыя суткі. Спачатку ў лабараторыі, потым ехалі да каго-небудзь дамоў. Часцей да А. С. Міхалёва (заўважу, што Аляксандр Сяргеевіч і дэкан факультэта, прафесар А. М. Шырокаў — навуковыя кансультанты работы). Аналізавалі зробленае, абмяркоўвалі планы на заўтра, нарэшце, проста размаўлялі, абменьваліся думкамі. Гэта для вынаходніка не самае апошняе.

Толькі перакрыжаванне думак можа прывесці да ісціны, — лічаць супрацоўнікі кафедры. Нічога тут не прымаецца як пастулат, аксіёма. Толькі той, хто ўмее заўважаць недахопы, валодае крытычным поглядам на рэчы і з'явы, зможа зрабіць вынаходніцтва. А адна, бадай, з самых галоўных умоў — атмасфера ў калектыве. Тут яна сапраўды творчая. Магчыма гэта ў нейкай ступені абумоўлена маладосцю калектыву кафедры. Узрост большасці супрацоўнікаў не перавышае трыццаці гадоў. Смеласць, рашучасць, улюбёнасць у сваю прафесію (я б сказала апантанасць) дапамагаюць вырашаць складаныя задачы, не пасаваць перад цяжкасцямі. Застаецца толькі здзіўляцца працаздольнасці нядаўніх выпускнікоў факультэта І. М. Чушанкова, В. А. Вярбіцкага, С. М. Сідарука, В. Д. Любецкага, В. В. Кузьмянкова і іншых. Гэта можна сказаць і пра ўсіх астатніх супрацоўнікаў кафедры.

У кожнага з іх свае задачы, свае функцыі ў гэтай рабоце. Яны ніколі не падлічваюць, хто больш зрабіў, хто менш. Галоўнае, мэта дасягнута: створана новая, надзейная сістэма кіравання універсальных электрамеханічных робатаў на аснове распрацаваных на кафедры бескантактных рухавікоў пастаяннага току (сервадзінаў) і мікрапрацэсарных рэгулятараў.

Што такое сервадзін? Гэта выканаўчы рухавік дыскрэтна бесперапыннага дзеяння. Да гэтага часу ні ў нас, ні за мяжой не было такіх рухавікоў, якія маглі б працаваць у двух рэжымах — крокавым і бесперапынным. Прычым сервадзіны здольны працаваць ва ўмовах адкрытага космасу, паблізу атамнага рэактара без абслугоўвання на працягу чатырохпяці гадоў. Калектарныя ж рухавікі, якія практыкаваліся раней (і практыкуюцца зараз), ужо прыблізна праз 250 гадзін бесперапыннай работы патрабуюць замены вугальных шчотак. Таму вучоныя кафедры прапанавалі замяніць іх электроннымі блокамі.

«Вельмі зацікаўлены вашай прапановай. Будзем удзячны, калі вышлеце нам дадатковую інфармацыю»,— такі водгук даслала італьянская фірма. А той факт, што работа калектыву (сярод іх і А. В. Кваша, Р. В. Овад-Марчук, С. С. Булай — вядучыя спецыялісты ВА «Гранат»), у якой разглядаюцца распрацоўка, стварэнне і ўкараненне выканаўчага ўзроўню мікрапрацэсарных сістэм кіравання універсальных робатаў павышанай надзейнасці, прадстаўлена на саісканне прэміі Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі, гаворыць сам за сябе. Створаная сістэма кіравання робатам стане таксама экспанатам Міжнароднай выстаўкі навукова-тэхнічнай творчасці моладзі краін — членаў СЭУ, якая пройдзе ў Брно (Чэхаславакія). Вынаходніцтвы кафедры (іх пяць) будуць дэманстравацца і на Міжнародным кірмашы ў Лейпцыгу (для параўнання: усяго ад універсітэта там будзе прадстаўлена восем экспанатаў).

— Усё гэта, вядома, добра, калі б не некаторыя акалічнасці,— заўважае кіраўнік творчага маладзёжнага калектыву, малодшы навуковы супрацоўнік С. М. Сідарук.— Унікальныя эксплуатацыйныя характарыстыкі рухавіка прыцягнулі ўвагу шэрагу арганізацый краіны. Яго хочуць выкарыстоўваць многія галіновыя прадпрыемствы Мінска, Ленінграда, Варонежа, Чарняхоўска і іншых гарадоў. На жаль, кафедра не можа задаволіць усіх заказчыкаў. Гэтаму ў многім перашкаджае абмежаваны фонд зарплаты па навукова-даследчых работах. Патрэбна таксама добрая вопытная база. Пры БДУ існуе СКТБ, але ім больш выгадна браць буйныя заказы збоку, а універсітэт — на правах беднага пасынка. А трэба, каб было наадварот: у першую чаргу выконваліся заказы БДУ.

Але члены кафедры кібернетыкі не вельмі скардзяцца. У іх ёсць добры партнёр — навукова-вытворчае аб'яднанне «Гранат» (ды і не толькі яно). Супрацоўніцтва пачалося разам з заснаваннем кафедры. І вынікі яго зараз відавочныя, бо не адна ідэя вучоных «ажыла» іменна тут, на «Гранаце». Вось і гэта распрацоўка, аб якой мы расказалі, таксама ўключана аб'яднаннем у Дзяржзаказ на 1989 год. І хоць не так хутка, як хацелася б супрацоўнікам кафедры кібернетыкі, распрацоўка будзе даведзена да серыйнага ўкаранення.

З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.



НА ЗДЫМКАХ:
* Рабочы момант кафедры.
* «Не, нешта тут не так»,— упэўнены асістэнт В. М. Малафееў.
* «Ты лічыш інакш? Калі ласка, прапануй».

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

# АД СЕСІІ ДА СЕСІІ...

## БІБЛІЯТЭКА

# ТРОХ-ПАКУТНІК

Тут — цішыня. За сталамі працуюць студэнты: чытаюць, канспектуюць, шукаюць у газетах і часопісах патрэбныя ім матэрыялы.

— Я тут знаходжуся толькі паўгадзіны,— кажа студэнтка III курса фізічнага факультэта С. Цвірка,— а ўжо адчуваю млявасць. Хочацца хутчэй усё скончыць і пайсці. Але абставіны не дазваляюць, вось і даводзіцца пакутаваць. Умовы для работы ва універсітэцкай бібліятэцы, сапраўды, не з лепшых. Вентылятараў тут няма, а па стомленых тварах студэнтаў адчуваецца, што яны не пашкодзілі б.

Я пытаюся наконт вентыляцыі ў пакоі старшага бібліятэкара залы прыродазнаўчых навук Н. Ф. Бахар.

— Мы, па-праўдзе кажучы, і не звярталі ўвагі на гэта.

А звярнуць усё ж такі трэба. У перыяд сесіі колькасць наведвальнікаў у бібліятэцы павялічваецца больш чым у два разы. Бываюць дні, калі прыходзіць столькі людзей, што не хапае месца, каб іх усіх размясціць. А на вуліцы — цяплынь.

Гэта стала нейкім рокам: пачалі знікаць лісты з работ Леніна, Маркса, Энгельса. Ёсць такія кнігі, дзе цалкам вырваны які-небудзь артыкул ці пастанова. Так робяць некаторыя студэнты, эканомячы час.

— Хаджу па зале, як наглядчык,— гаворыць бібліятэкар Г. І. Барылава.— Сачу, каб не рвалі кніг, не кралі, але і гэта не дапамагае. Не магу зразумець, як дарослыя людзі могуць так адносіцца да кніг?

Крыўдна, што за некаторых безадказных студэнтаў даводзіцца пакутаваць многім.

— Іншы раз можна патраціць цэлы дзень, каб заканспектаваць работу У. І. Леніна,— скардзіцца студэнтка першага курса гістарычнага факультэта Ала Андрыенка.— Бяру том, а артыкула няма. Нехта вырваў. Бягу на шосты паверх у наш кабінет гісторыі КПСС, а там тое ж самае. Даводзіцца ехаць у Ленінскую бібліятэку, а часу не заўсёды хапае.

Як змагацца з гэтым злом? Лічу, што выкараніць яго можна толькі калі ўсе мы будзем больш патрабавальнымі да сябе, сваіх учынкаў. Хіба будзе тады існаваць такая праблема? Зразумела, не.

М. НАРЭЙКА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

## СТАЛОВАЯ

# «Мы — едакі паняволі»

Сесія, вядома, пара вельмі напружаная і нервовая. Часу не хапае катастрафічна. Падручнікі, бібліятэка, зноў падручнікі... Адрываешся, толькі каб пад'есці, і зноў за падрыхтоўку. Вось тут давайце і паглядзім, што прапануюць і чым кормяць універсітэцкія сталовыя студэнтаў.

Адразу заўважу, што змен да лепшага не бачна. Аб гэтым сведчаць і шматлікія размовы са студэнтамі ў сталовых. Ні аб якім хуткім і якасным абслугоўванні і разнастайным асартыменце ежы гаварыць не даводзіцца. Вось некаторыя заўвагі студэнтаў.

СТАЛОВАЯ ГАЛОЎНАГА КОРПУСА БДУ.

— Тут мы ядзім, калі няма часу схадзіць куды-небудзь. Асартымент вельмі дрэнны, посуд не мыецца, падносы брудныя. У пачатку семестра неяк лепш было, а зараз зусім кепска. (Б. Кныш, С. Германовіч, І курс, ФПМ).

— Калі надыходзіць сесія, займаемся ў «чыталцы», таму хочаш-не хочаш, а пойдзеш у гэтую сталовую. Меню тут паўтараецца з дня ў дзень. Адно добра, што цэны нізкія, не такія, як у іншых месцах. Даводзіцца трываць. Але тут яшчэ нічога. Вы ведаеце, як завуць сталовую інтэрната № 7? «Ташнілаўка». Там яшчэ горш, чым тут, і акрамя таго ў апошні час адміністрацыя пачала мяняць распарадак дня. У нядзелю цяпер сталовая не працуе, як было раней. Даводзіцца ездзіць і шукаць іншыя сталовыя. А іх у выхадны дзень не так ужо і многа. І гэта ў час сесіі. (В. Дробыш, В. Капырын, II курс, мехмат).

— Другое і трэцяе сёння зроблена нядрэнна, а першае з рук вон кепска. Ні салатаў з капусты, ні з буракоў. Адна каўбаса з гуркамі і ўчора, і сёння, і на заўтра будзе. Калі ацэньваць работу сталовай, мы паставілі б тры балы. (Н. Бортнік, Н. Захаркевіч, II курс, фізфак).

ФІЛІЯЛ СТАЛОВАЙ № 33 НА ХІМФАКУ:

— Стараемся заходзіць сюды праз дзень-другі. Гатуюць нясмачна. Здараецца, возьмеш абед і амаль увесь выкінеш. Але што зробіш, у нас грамадскае харчаванне ўсюды такое. Толькі вось цікава, а самі яны гэта ядуць? Атрымліваецца, што адзін раз сходзіш паснедаць, потым тыдзень памятаеш. (Л. А. Сакалова, загадчыца кабінета палітэканоміі кафедры гуманітарных факультэтаў; Р. Э. Даражынская, лабарант кафедры гісторыі філасофіі).

СТАЛОВАЯ № 33:

— Кормяць як калі, бывае добра, а часцей дрэнна. Падабаецца рыс, рыба, каўбаса.



Садавіна і гародніна бывае вельмі рэдка. У буфет не заўсёды своечасова ўсё завозяць. Не падабаецца, што цэны напісаны маленькімі літарамі, неспадручна чытаць, таму цяжка хутка падлічваць і разлічвацца з касірам. (С. Хікфа, І. Нарэндрасінге, замежныя студэнты падрыхтоўчага аддзялення).

— Вечарам у мінулы чацвер узяў першае. Суп быў рыбны з бульбай. Бульба парэзана дробненька, але нейкая цёмная, слізкая, яе мабыць і свінні не сталі б есці. Гэта здарылася не першы раз, і таму я пайшоў да загадчыцы вытворчасці, каб яна растлумачыла, колькі часу будуць карміць яшчэ такой бульбай. Яна спакойна мне адказала: «Бульба, сапраўды, дрэнная, праз месяц будзе маладая, тады і ешце». «Дык што, мне месяц чакаць, не есці суп?» — пытаюся я. «Я б пакуль што вам яе есці не раіла»,— быў канчатковы адказ. (А. Канаваленка, І курс, журфак).

СТАЛОВАЯ ІНТЭРНАТА № 7:

— Раз у дзень абавязкова тут ядзім. Сёння нясмачна. Бывае нядрэнна гатуюць і выбар вялікі, а здараецца, няма чаго есці. Сурвэтак амаль ніколі не бывае. (Ю. Хітры, В. Залеўскі, філфак).

Вось такія невясёлыя водгукі пачулі мы ад наведвальнікаў сталовых БДУ. Як бачыце, яны не на карысць работнікаў грамадскага харчавання.

Між тым, ідзе сесія.

Таму вынікаў чакаем неадкладных.

А. МАКСІМАЎ.

Што тут пра яе казаць? Звычайная.

Магчыма, яшчэ бацькі твае, выслухаўшы тыя ж парады і словы на дарогу, адчынялі дзверы аўдыторыі, за якімі ішоў экзамен. І старэйшы брат дасканала ведаў усю тысячу рэцэптаў напісання шпаргалак і спосабаў размоў з самымі рознымі па характару выкладчыкамі. Нядрэнна атрымлівалася. Толькі табе, на шчасце, гэты вопыт яго не спатрэбіцца. На шчасце, таму што, нарэшце, да справы перабудовы вышэйшай школы пачалі адносіцца сур'ёзна.

Наступная сессія — першая пасля прынятай на лютаўскім (1988 г.) Пленуме ЦК КПСС пастановы «Аб ходзе перабудовы сярэдняй і вышэйшай школы і задачах партыі па яе ажыццяўленню». Гэта яна — першая (а таму самая важная) прыступка ў ажыццяўленні мэты забеспячэння новай якасці навучання і выхавання моладзі.

Толькі ці дастаткова сур'ёзна ставяцца да яе тыя, хто вучыцца, і тыя, хто павінен студэнтам дапамагаць? Прапануем меркаванні нашых карэспандэнтаў, якія пабывалі ў экзаменацыйнай аўдыторыі завочнага факультэта, ва універсітэцкай бібліятэцы, у філіялах сталовай №33.

## АЎДЫТОРЫЯ

# ЯКІ Ж СТУДЭНТ-ЗАВОЧНІК?



Можа занадта прыдзірлівае вока ў мяне? І экзамен даволі складаны — гісторыя КПСС. І вопыту гутаркі з выкладчыкам не маюць. Бо не такая ўжо і вялікая практыка — некалькі лекцый і семінараў перад самым экзаменам. Яны ўсяго толькі студэнты трэцяй групы І курса геаграфічнага аддзялення завочнага факультэта.



Няўпэўнена пазіралі на дзверы. І пасля чарговай прапановы выйсці да стала экзаменатара адмаўляліся, сарамліва чырванеючы: «Зусім трошкі засталося...»

З АДКАЗУ НА ЭКЗАМЕНЕ. «Якія формы работы павінна была сплачаць партыя ў час разгулу рэакцыі? Пэўна, легальную і нелегальную. Калі не мелі магчымасці болей адкрыта выступаць, праводзілі нелегальныя сходы. Або паўлегальныя, калі прадстаўнікі ўрада ведалі, што будзе сход, а вось дзе і калі...»

— Перавучыла, перахвалявалася дзяўчына,— апраўдваем аднадушна мы з выкладчыкам Аляксандрам Уладзіміравічам Царуком. Іначай, нават прыгадаўшы школьную праграму, назвала б і ўдзел бальшавікоў у Дзяржаўнай Думе, і іх публікацыі ў легальных выданнях.

Хаця чаго, здаецца, хвалявацца? Такіх добразычлівых адносін, калі выкладчык падбадзёрвае, супакойвае, спрабуе дапамагчы наваднымі пытаннямі, я не бачыла за ўсе пяць гадоў свайго студэнцкага жыцця.

Толькі «дапаможныя» пытанні чамусьці больш за ўсё «заблытвалі». Нават самыя простыя з іх «Чым адрозніваецца сацыялістычнае спаборніцтва ад буржуазнай канкурэнцыі?», «Хто такія «ліквідатары» і «адзавісты»?», «Калі праходзіў VI з'езд партыі?» не маглі не прывесці большасць адказваючых у «тупік». Таму што адказы прачытваліся «з ліста».

Не хваляваліся, калі даставалі з торбаў падручнікі, не тоячыся перапісвалі літара ў літару чыесьці канспекты. Пачуўшы ж пытанне «Чым адрозніваецца харчпадатак ад харчразвёрсткі?», звярталі насцярожаныя і запытальныя позіркі на сяброў.

Затое потым, выхваляючыся, расказвалі ў калідоры: «Падручнік не адкрывала...»

Паспрабавалі разабрацца разам, ці патрэбна завочніку вучыцца?

КАМЕНТАРЫЙ ВЫКЛАДЧЫКА. Яго дае экзаменатар А. У. Царук:

— Не забывайцеся, што студэнты да нас прыходзяць розныя. Хто за сапраўднымі ведамі — тыя нават на адзнаку часам не звяртаюць увагі, спрачаюцца, даказваюць уласную думку, якая ўзнікла ў выніку вывучэння (не перапісвання!) не аднаго падручніка. Хто са згодай атрымаць «коркі» у першы ж дзень, з патрабаваннем стварэння спрыяльных умоў: «ліпавых» залікаў, адчапных «троек». Нам, выкладчыкам, зразумела, даспадобы першыя. Іх адразу вылучаем ужо па выкананню кантрольных работ. Раней завочны факультэт называўся так не толькі з-за адсутнасці штодзённых лекцый, але і таму, што праверка ведаў адбывалася таксама ў завочнай форме. Вось і ўявіце сабе становішча, у якое трапляў кожны выкладчык: бачу работу, а хто і як выконваў яе — у поўным няведанні. А зараз, абмеркаваўшы гэта пытанне на кафедрах, вырашылі праводзіць дні завочнікаў. Шэсць дзён у семестр. З'явілася магчымасць даведацца, ці па-сапраўднаму і самастойна працаваў студэнт над кантрольнай. У выкладчыкаў аб'ём работы, вядома, павялічыўся, але ж і карысці больш. Раней была кантрольная для студэнтаў у асноўным механічна-капіравальнай працай, зараз патрабуецца ўдумлівы падыход, большая адказнасць за якасць выканання работы, больш глыбокае вывучэнне першакрыніц. Думаю, і ў падрыхтоўцы да экзаменаў гэта павінна дапамагчы. Не можа не застацца ў свядомасці пытанне, якое студэнт вывучаў самастойна, абмяркоўваў з выкладчыкам.

КАМЕНТАРЫЙ СТУДЭНТА. Л. А. Душкевіч, настаўніца пачатковай школы.

— А вы спрабавалі калі-небудзь падысці на тую ці іншую кафедру ў дзень завочніка? Па-першае, не заўсёды гэта субота, а нават калі і так, то вучняў, калі сам сабе замены не знойдзеш, адных у класе не пакінеш, каб прыехаць у Мінск. Па-другое, дзяжурства арганізоўваецца на пэўны час. З дзесяці да шаснаццаці, напрыклад. А здараецца, патрэбнага выкладчыка знойдзеш толькі а палове першай. Тут не да абмеркавання — дамоў збіраешся хутчэй. Ды і спалучаць адначасова работу, вучобу і клопаты аб сям'і цяжка. Мне вучыцца падабаецца. Але ж калі б не прымушалі ў школе набываць вышэйшую адукацыю, пэўна, не пайшла б. Цяжка.

КАМЕНТАРЫЙ АЎТАРА. Сёння на завочным факультэце вучыцца 4466 студэнтаў. Да даных статыстычнай справаздачы за 1986—1987 гады выбыў 191 чалавек (па непаспяховасці — 155), на другі год засталося 15 студэнтаў.

Вынікі міні-апытання выкладчыкаў і саміх студэнтаў пераконваюць, што менш за палову з іх ставяцца да вучобы сур'ёзна. Аб гэтым сведчаць роўныя радкі «здавальняючых» адзнак у залікоўках.



Не думаю, каб задавальняла гэта выкладчыкаў універсітэта і кіраўнікоў тых прадпрыемстваў, куды прыйдуць працаваць выпускнікі завочнага. Лічу, не патрэбна гэта нашай рэспубліцы і не спрыяе развіццю народнай гаспадаркі.

Але ж бачу паблажлівыя вочы аднаго, другога, трэцяга выкладчыка, лагодную ўсмешку і добрую руку, што ставіць подпіс пад чарговым «здавальняюча», сустракаюся з радасным позіркам уладальніка «пасрэднай» залікоўкі і пачынаю сумнявацца ў сваіх перакананнях.

З. МАРАВА.

**ТУРЫСТЫЧНАЯ група. Часцей за ўсё сустракаюцца незнаёмыя людзі, дзеляць на ўсіх небяспеку і цяжар дарогі. Вяртаюцца дамоў і на другі ж дзень тэлефануюць адзін аднаму, дамаўляюцца аб новым сумесным вандраванні, або... пры выпадковай сустрэчы адводзяць вочы. Чаму? Што робіць адных сябрамі, другіх разводзіць назаўсёды? Чаму нехта пасля вяртання стараецца не ўспамінаць гэты «кашмар», а нехта расказвае і расказвае аб ім?**



ТУРЫСЦКІМІ СЦЕЖКАМІ

# Камандзір, група, дысцыпліна







— ПАХОД УДАЎСЯ, калі кожны ўдзельнік атрымаў ад яго задавальненне,— гэта словы Сашы Левіна. У апошняй цяньшаньскай вандроўцы ён быў, бадай, самым лепшым удзельнікам: вопытны, дысцыплінаваны, камунікабельны, гатовы ў любую хвіліну дапамагчы. А галоўнае — па-мужчынску галантны. Хіба не прыемна любой дзяўчыне атрымаць кветкі сярод снягоў перад самым перавалам? А ўсёй групе пачуць вясёлую гісторыю якраз у той момант, калі рэчмяшок ужо здаецца стопудовым, пад'ём страшэнна крутым, паход нудным і непрыемным? Безумоўна, ён правы. Але ж людзі вельмі розныя. Аднаму падабаюцца цяжкасці і рызыка, другому хочацца цішыні і спакою. Як ім абодвум дагадзіць? Узнікае і яшчэ адно пытанне: калі ад паходу атрымлівае задавальненне кожны ўдзельнік, то, напэўна, кожны ў сваю чаргу павінен унесці нешта сваё, асабістае ў жыццё групы. Але ці заўсёды так бывае? Калі не, то чаму? Слова Сашу Левіну, кіраўніку нашага паходу, кандыдату ў майстры спорту па турызму:

— Група пачынаецца (зразумейце мае словы правільна) з камандзіра. Іменна ён часцей за ўсё падбірае астатніх удзельнікаў, ён у першую чаргу адказвае за мікраклімат у калектыве. Я ўдзельнічаў у многіх паходах, давялося быць і кіраўніком. Таму магу цвёрда заявіць: калі камандзір з першага дня не заваюе аўтарытэт або нейкім чынам згубіць яго, то можна быць упэўненым — паход не атрымаецца. Вельмі важна, каб асоба камандзіра спалучала ў сабе і фармальнае, і нефармальнае лідэрства.

Проста сказаць — лідэрства фармальнае і нефармальнае. А як яго заваяваць? Успамінаю першы дзень свайго кіраўніцтва. Ралля, група ўжо некалькі гадзін ідзе па азімуту. Вечарэе. Усе ў паходзе удзельнічаюць упершыню, бачу, што стаміліся, але ж не спынішся: нідзе няма вады. Нарэшце натыкаемся на невялічкі ручаёк. Камандую:

— Наташа з Алегам — днявальныя, Віця з Андрэем — ставіць палатку, астатнія — за дрывамі! У адказ ад Наташы чую: «Мы хочам з Анжэлай дняваліць». Прывыклі дзяўчаты, што я для іх проста сябар, не разумеюць, што ў паходзе сітуацыя зусім іншая. Я маўчу, пакуль згаджаюся. Ставім палаткі, сшываем са спальнікаў «сістэмы», дзяўчаты згатавалі і... пачалі есці. Ды такога ў сапраўдным паходзе ніколі не бывае, каб палова групы працавала, а другая ўжо расселася вакол кацялкоў. Я маўчу, хоць усё ўнутры ўжо «закіпае». І толькі калі павячэралі, калі ўсе ўжо падрыхтаваліся спяваць, пачаў падводзіць вынікі першага дня. Сказаў аб тым, што ў турызме існуюць свае законы, што камандзір нясе за ўсіх удзельнікаў юрыдычную адказнасць, што слова камандзіра павінна быць законам для астатніх, што толькі дысцыплінаваны калектыў пасапраўднаму цікава пройдзе ўвесь маршрут і вернецца дадому без ніякіх здарэнняў. Рэзка выказаў, сам не чакаў ад сябе такога. А дзяўчаты сядзелі ашаломленыя, відаць, і думаць не маглі, што будзе такая размова. Устаў Віця Чарняўскі, прамовіў:

— Усё, што сказаў камандзір, правільна. Вы ў паходзе ўпершыню, таму, магчыма, не ведалі.

І пасля слоў Віці маўчанне. Цяжкае, панурае. Папрасілі Іру Капусціну ўзяць гітару. Яна праспявала некалькі песень — напружанне не праходзіць. І толькі калі спяваць узяўся Віця Чарняўскі (без голасу, без слыху) — усіх нібыта прарвала, дружна пачалі яму дапамагаць. І да апошняга дня паходу не ўзнікала ніякіх пытанняў аб дысцыпліне, а потым сустракаліся як самыя лепшыя сябры.

ПСКОЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ. Сустрэліся з лесніком. Пакуль камандзір размаўляў з ім, частка групы вырвалася наперад. На развілцы дарог не пачакалі, звярнулі направа, прайшлі дзесьці кіламетр, прыселі. Віця Бунта даганяе і, ні слова не гаворачы, паварочвае назад. Група нічога не разумее, незадаволена глядзіць яму ў спіну. Потым нехта ўскоквае і са словамі «Таварыш камандзір, я самы верны, самы адданы турыст! Я першы іду за вамі!» подбегам нясецца за Бунтай. За ім са смехам падымаюцца ўсе астатнія.

КРЫМ, ПЛАТО, ТУМАН. Група ўперлася ў каньён. Як абысці яго? Тут мы раздзяліліся. Адны прапанавалі накіраваць направа, другія — налева, а трэція наогул выказалі жаданне павярнуць назад. Камандзір жа вырашае спускацца ўніз. Крок, яшчэ адзін. Постаць камандзіра становіцца ледзь бачнай у тумане, хвіліну ўсе моўчкі глядзяць услед. Таня Сцяшэнка кранаецца з месца першай. Група расцягваецца, недзе ўнізе разведвае дарогу Саша Левін, замыкае, як заўсёды, Ігар Драбышэўскі. А туман такі, што не відаць ні нізу, ні верху каньёна. Кавалак крутога схілу, альпеншток у руках, рэчмяшок за плячыма, таварышы побач — вось твой свет у гэты момант. І ва ўсіх адна надзея, адна мара — вырвацца з гэтай туманнай завесы, зразумець, нарэшце, дзе мы знаходзімся. Спускаемся. Дно каньёна амаль сухое. Спрабуем ісці па ім, але дарэмна: зноў трэшчына. Трэба падымацца наверх. І толькі калі нарэшце выйшлі на доўгачаканую сцяжынку, Саша Левін спыніўся і прамовіў:

— А зараз вы можаце сказаць усё, што пра мяне думаеце.

Група маўчала, бо камандзір усё ж сам вывеў на дарогу.

Ва ўсіх апісаных выпадках акрамя слоў і рашэнняў камандзіра быў яшчэ нехта, хто першы ішоў за ім, першы падтрымліваў. С. Левін усміхаецца:

— Задача камандзіра — набраць як мага больш такіх надзейных людзей і... не страціць у іх аўтарытэт.

А як жа быць з тымі, хто проста ідзе, не прыносіць нікому ні радасці, ні расчаравання? Праходзіць час, і ты не зможаш нічога пра яго сказаць — ні добрага, ні дрэннага. Ці патрэбны такія людзі ў калектыве?

Саша Левін хвіліну разважае, потым гаворыць, абдумваючы кожнае слова:

— Я лічу, любы чалавек мае права ўдзельнічаць у паходзе. Безумоўна, дрэнна, калі ён маўклівы, некамунікабельны. Але ж іменна крытычныя моманты, цяжкасці могуць так уздзейнічаць на чалавека, каб ён стаў другім. Разумееце, у большасці сваёй турысты — гэта людзі, якія могуць рабіць амаль усё: яны і ежу гатуюць, і вопратку падрамантуюць, і работы ніякай не баяцца. Таму калі ў такі калектыў трапляе які-небудзь беларучка, то ён або падпарадкоўваецца турыстычным законам, або наступны раз застаецца дома. Дарэчы, я і сам да заняткаў турызмам мала што ўмеў. А зараз і фатаграфую, і палаткі шыю, і на гітары навучыўся іграць. А галоўнае, пазнаёміўся з многімі цікавымі людзьмі. Хочацца быць падобным да іх, таму і сам цягнуся за імі, і іншым стараюся не перашкаджаць. Была ў маёй групе дзяўчына. Ціхая, спакойная, ніякіх у мяне ўражанняў ад яе не засталося. На наступны год папрасілася ў «двойку» — я не адмовіў. Думаў, магчыма, зараз яна як-небудзь раскрыецца. Праз год пажадала пайсці ў «тройку». Што мне сказаць, што група ўжо ўкамплектавана? Пакрыўдзіць чалавека толькі за тое, што ён ідзе моўчкі, не жартуе, не спявае песні? Не змог, узяў. Няўдалы гэты прыклад, бо часцей вандроўкі ўсё ж уздзейнічаюць на чалавека. Але я лічу, што кожны мае права быць членам турысцкага калектыву, калі ён, зразумела, не закончаны эгаіст.

— Безумоўна, вандроўка — гэта адно з самых выдатных месц, дзе чалавек можа праверыць, на што ён здольны. Тут табе і цяжкасці дарогі, і крытычныя моманты, і калектыў, які цябе зусім не ведае, і ты можаш зарэкамендаваць сябе, як захочаш. Гэта як невялікая глава ў новай кнізе — бяры ручку, запісвай, потым пачытаем усе разам. Але як размежаваць такія паняцці, як ініцыятыўнасць і недысцыплінаванасць удзельнікаў? Што ты, як камандзір, думаеш аб гэтым?

Саша ўсміхаецца:

— Прабач, але пачну з цябе. У час апошняй вандроўкі былі моманты, калі я проста радаваўся, што ў групе ёсць такі чалавек. Але былі імгненні, калі хацелася ўзяць нешта ў рукі і так стукнуць, каб ты ўжо ніколі не адышоў у іншы бок. Ты са сваёй ініцыятывай пераеў мне нерваў больш, чым усе астатнія ўдзельнікі.

Што ж, не надта прыемна пачуць такую ацэнку, але ад праўды нікуды не дзенешся. У групе амаль заўсёды знаходзіцца чалавек, які думае крыху не так, як камандзір, які не заўсёды гатовы падпарадкавацца, які на кожны выпадак мае сваё меркаванне. Добра гэта ці дрэнна?

— Безумоўна, добра. Удзельнік не павінен быць проста вінцікам у руках кіраўніка і механічна выконваць усе яго загады, але... перашкаджаць камандзіру кіраваць таксама не трэба.

— А калі камандзір робіць памылку за памылкай, калі яго аўтарытэт губляецца? Успомнім мінулагоднюю групу Кін-Камінскага, якая пад канец свайго паходу амаль цалкам распалася.

— Бывае і такое, але ўдзельнік, які становіцца неафіцыйным лідэрам, павінен карыстацца сваім лідэрствам вельмі асцярожна і па магчымасці падтрымліваць аўтарытэт афіцыйнага — камандзіра. Таму што ў такім паходзе будзе цяжка не толькі камандзіру, але і ўсім астатнім удзельнікам. Нельга атрымаць сапраўдную асалоду ад зносін, прыніжаючы нечую чалавечую годнасць. Я лічу, што камандзір ёсць камандзір, які б ён ні быў. Ужо вярнуўшыся дамоў, пры падвядзенні вынікаў, можна выказаць усе заўвагі. А ў паходзе яго слова павінна быць галоўным.

Вандроўкі... Людзі чакаюць іх з нецярпеннем, зноў і зноў адкрываюць для сябе нешта незвычайнае. Але чаму не заўсёды яны прыносяць задавальненне? Можа бывалыя турысты ды і навічкі таксама пажадаюць падзяліцца сваім вопытам? На вуліцы ж лета, збіраюцца і збіраюцца новыя групы. Магчыма, ім дапамогуць вашы парады.

С. ПЛЫТКЕВІЧ.
Фота аўтара.



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
9 чэрвеня
Зак. 1626.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.